# Профільнае навучанне ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі

У бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку», 2006, № 4, які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, змешчаны бібліяграфічны спіс «Профільнае навучанне ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі» (складальнік Т.Г.Канавалава. Навукова-педагагічная бібліятэка НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»).

Анатаваны бібліяграфічны спіс ахоплівае выданні (кнігі, артыкулы) беларускіх і расійскіх выдавецтваў за апошнія пяць гадоў на беларускай і рускай мовах па вышэйназванай праблематыцы.

Спіс складаецца з наступных раздзелаў: «Мэты і змест профільнага навучання»; «Профільнае навучанне – вопыт, праблемы, перспектывы»; «Мультыпрофільнае навучанне»; «Вучэбныя прадметы ва ўмовах профільнага навучання»; «Біялогія»; «Геаграфія»; «Інфарматыка»; «Матэматыка»; «Хімія»; «Прафілізацыя сельскай школы»; «Сучасная школа за мяжой». Літаратура, прадстаўленая ў спісе, можа быць выкарыстана навуковымі супрацоўнікамі, выкладчыкамі, настаўнікамі і выхавальнікамі.

*К.Д.Варанько,*
*вядучы бібліёграф*
*Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*